Радыё “Рацыя”
17.04.2019

# Нотр-Дам-дэ-Пары: больш чым сабор



15 красавіка, адбылася сапраўдная культурная катастрофа – пажар у саборы Нотр-Дам-дэ-Пары ў Францыі. Гэты гатычны храм з’яўляецца не толькі сімвалам французскай сталіцы, але таксама скарбам сусветнай культуры. Людзі з усяго свету ехалі ў Парыж, каб паглядзець на гэты архітэктурны шэдэўр. Ён прываблівaў шматлікіх мастакоў і пісьменнікаў. Лёс сабора на працягу стагоддзяў складваўся па-рознаму. Ён неаднаразова разбураўся і ўзводзіўся нанова. У XIX ст. храм знаходзіўся ў такім кепскім стане, што ставілася пытанне пра яго знос. Выратаванню сабора ад руйнавання і здабыццю славы шмат у чым спрыяў аднайменны гістарычны раман Віктора Гюго, апублікаваны ў 1831 г. У 1841 г. пачалася рэстаўрацыя храма, якая працягвалася больш за 20 гадоў. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца ўнікальныя матэрыялы, якія даюць уяўленне пра выгляд сабора ў XVIII – XIX стагоддзях. 16 красавіка ў Музеі кнігі адкрылася міні-выстава ў знак салідарнасці і спачування, прысвечаная Сабору Парыжскай Божай Маці. На ёй можна будзе пабачыць выданні 1830-ых гг. славутага рамана В. Гюго, эстампы з відамі Нотр-Дама мастака Шарля Мер’ёна 1850-ых гг., выявы інтэр’ераў сабора з каранацыйнага альбома Напалеона Банапарта 1804 г., абрысы храма на мапе Парыжу 1734 г. і інш. Час работы выставы адпавядае рэжыму работы музея кнігі. Уваход – па чытацкім білеце або білеце сацыякультурнага цэнтра. Выстава будзе працаваць у музеі кнігі (пам. 347) да 30 красавіка 2019 г. Тэлефон для даведак (8 017) 293 27 22.